Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. За заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 40 Вільня, Субота 20-га жніўня 1927 г. Год I

№ 39 „Нашае Праўды“ з 17-га жніўня сканфіскаваны па загаду камісара ўраду на м. Вільню за зьмяшчэньне перадавіцы пад загалоўкам „Агентуры“ і заметкі (перадрук з польскіх газэт) „Дэманстрацыі і разрухі на груньце беспрацоўя“.

Загаловак апошняе заметкі гаворa сам за сябе. У стацьці „Агентуры“—у сувязі з заявай марш. Пілсудскага аб дзеючых у Польшчы (сярод палякоў!) чужацкіх агентурах—выясьнялася, якія чужацкія агентуры „працуюць“ сярод беларусаў...

Што „праступнага“ знайшла ў гэтым польская адміністрацыя,—зразумець ніяк ня можам.

Заклік на часе.

Ад 31 ліпня 1924 году існуюць у Польшчы законы, якія ўстанавілі *варункі* дзеля адкрываньня беларускіх урадавых школаў, каторыя Польская дзяржава—на падставе гэтых-жа законаў—*абязана* даць беларускаму народу.

Ад 7-га студзеня 1925 году існуе ў Польшчы выканаўчае распараджэньне міністэрства асьветы, якое ўстанавіла *правілы* правядзеньня ў жыцьцё гэтых законаў.

Ад вясны 1925 году беларускае насяленьне Заходняе Беларусі што-годна робіць вымаганыя школьнымі законамі Польшчы захады аб адчыненьне дзяржаўных школаў у роднай беларускай мове, точна выпаўняючы ўсе ўстаноўленыя ўрадам правілы. Да гэтага мамэнту пададзены ўжо дзесяткі тысячаў дэкларацыяў з дамаганьнем беларускае школы.

А вынік гэтага?

Вынік той, што, ня гледзячы на ўсе выданыя законы і распараджэньні, ня гледзячы на зробленыя беларускім насяленьнем на падставе гэтых законаў і распараджэньняў захады,—польскі ўрад не адчыніў яшчэ ніводнае ўрадавае беларускае школы на кошт дзяржавы...

Для людзей, якія ня могуць сабе прадставіць, каб у „дэмакратычнай“ і „парляманцкай“ рэспубліцы існуючыя законы і ўрадавыя распараджэньні маглі невыпаўняцца,— гэта ўсё можа паказацца непадобным да веры. Аднак-жа ўсё гэта—*бясспрэчная праўда*.

Больш таго: беларусы ў Польшчы прымушаюцца ўладай вучыць сваіх дзяцей у польскіх урадавых школах, якімі—супраць волі насяленьня—густой сеткай пакрыты ўвесь прастор Заходняе Беларусі. Бо-ж вось ад верасьня сёлетняга году ў нас уводзіцца *школьны прымус*, які—ў сувязі з невыпаўненьнем школьных законаў у адносінах да беларусаў—прымае яўна характар прымусу навучаньня беларускіх дзяцей у *польскай* школе.

Такі істотны *сэнс* мае ведзеная польскімі школьнымі ўладамі асьветная палітыка ў Заходняй Беларусі. Такі юрыдычны *зьмест* апошніх урадавых загадаў і распараджэньняў у галіне народнае асьветы ў нашым краю.

Ясна, што з гэтым беларускае насяленьне нашага краю моўчкі згадзіцца ня можа: бо-ж уся гэтая палітыка рэзка разыходзіцца і з духам польскага заканадаўства ў школьных справах (яно, як сьцьвярджае канстытуцыя Польшчы, мае на мэце даць няпольскаму насяленьню поўную волю ў выбары мовы навучаньня), і з точнымі загадамі школьных законаў.

Што-ж рабіць?

Адказ на гэтае пытаньне дае зьмешчаная ў гэтым нумары адозва Галоўнае Управы Таварыства Беларускае Школы. І мы можам толькі шчыра прывітаць ініцыятыву гэтае галоўнае нашае культурнае ўстановы і далучыцца да заклiку, зробленага адозвай.

ГРАМАДЗЯНЕ БЕЛАРУСЫ!

Быў час, калі Вы, ведаючы, якое вялікае мае значэньне родная школа, дамагаліся беларускае школы і дзеля гэтага падавалі дэкларацыі. 1-га верасьня пачнуцца ўсюды ў школах заняткі, — значыцца, блізка час, калі Вашыя дамаганьні павінны быць споўнены. Але тыя, што ўвесь час не давалі Вам беларускай школы, што ўсялякімі спосабамі стараліся замест роднай накінуць Вам — на Вашу загубу — чужую польскую школу,—і сёлета, мо' ў апошні раз, пастараюцца ізноў ня даць вам беларускай школы ды запісаць дзяцей вашых у польскія школы. Зробяць яны гэта, спадзяючыся, што нашае сялянства, занятае цяжкой працай у полі, забылася аб сваіх павіннасьцях і правох вучыць дзяцей у роднай мове.

Дык усе беларусы, як адзін, **прыпомнім** ім гэтае нашае сьвятое права. Пакажам усяму сьвету, што мы **станоўча** дамагаемся беларускае школы і іншае школы ня хочам.

Зрабіць гэта мы **павінны як найхутчэй**, бо потым будзе позна.

Заклікаючы ўсіх да гэтага, Галоўная Управа Т-ва Беларускае Школы ніжэй вылічае, што трэба зрабіць:

1) Міністэрства Асьветы выдала загад, што ў сёлетнім школьным годзе ўводзіцца абавязкавае вучэньне ў школах усіх дзяцей школьнага веку. Паводле гэнага загаду бацькі яшчэ ў гэтым месяцы (жніўні) павінны запісаць дзяцей у ўрадовую школу або наказаць свайму школьнаму інспэктару, што будуць пасылаць іх у прыватную школу, або вучыць дома. Гэтакі ёсьць загад Міністэрва Асьветы.

Дык бацькі, каторыя падавалі дэкларацыі на ўрадовую беларускую школу, павінны цяпер падаць свайму школьнаму інспэктару заяву (пабеларуску) гэтакага зьместу:

Пану Школьнаму Інспэктару . . . павету.

Пётры, сына Язэпавага Пракаповіча, што жыве (напісаць, дзе жыве вёску і гміну).

ЗАЯВА.

Спаўняючы загад Міністэрства Асьветы, наказую, што буду пасылаць сваіх дзяцей (напісаць імя й век) у беларускую ўрадовую школу (паказаць дзе), каторая ў нас згодна з языковым законам з дня 31. VII. 1924 г. і Распараджэньнем Мін. Рэл. Спраў і Публ. Асьветы ад 7. I. 1925 г. павінна быць адчынена, бо мы падалі на яе дэкларацыі.

Дзень напісаньня. Подпіс.

Кожны бацька ці маці піша асобную заяву, а ўсе заявы разам вязе да школьнага інспэктара паўнамочнік ад дадзенае мясцовасьці (вёскі, засьценку, мястэчка, ці некалькіх вёсах), або яны перасылаюцца, таксама дзеля меншых коштаў, разам па пошце ўпісным (заказным) лістом.

Сьпісак (а не асобныя заявы) тых асоб (разам з азначэньнем дзяцей і іх веку), каторыя гэтыя заявы пашлюць школьнаму інспэктару, трэба пераслаць у Галоўную Управу Т-ва Беларускае Школы.

2) Усе тыя, што дэкларацыі на родную беларускую школу з розных прычынаў летась у восень і зіму да 31-га сьнежня не падавалі, павінны напісаць (пабеларуску) супольную ад усяе вёскі ці засьценку і падаць заяву, гэткага зьместу:

Мы, ніжэйпадпісаныя жыхары (назваць вёску, або мястэчка) дамагаемся для сваіх дзяцей беларускае ўрадовае школы.

(Далей падпісацца ўсім бацьком і апякуном з азначэньнем імён дзяцей і іх веку).

Так-жа маюць рабіць тыя беларусы, што жывуць у вялікіх местах.

Калі не згаджаюцца падпісацца пад такою заявою ўсе бацькі дадзенае мясцовасьці (вёскі і іншых), дык няхай падпішуцца тыя, што хочуць падпісацца.

Гэтую заяву трэба пераслаць у Галоўную Управу Т-ва Беларускае Школы. Гэтыя заявы будуць мець вялікае значэньне дзеля здабыцьця беларускае школы ў дадзенай мясцовасьці і наагул.

3) Усе тыя бацькі ці апякуны, каторыя дэкларацыі на родную беларускую школу з розных прычынаў летась у восень і зіму да 31-га сьнежня **не падавалі**, павінны лічыць сваім грамадзкім абавязкам падаць іх у гэтым годзе, пачынаючы ад 1-га верасьня да 31-га сьнежня.

Па інструкцыі ў гэтай справе зварочвайцеся ў Галоўную Управу Т-ва Беларускае Школы ў Вільні, вул. Сьв. Анны 2 — 3.

Калі ў даным месьці ці вёсцы не набярэцца дэкларацыяў на поўны камплект, гэта значыць на 40 дзяцей, то падавайце стольκі, сколькі набярэцца, бо ўсе пададзеныя дэкларацыі будуць мець вялікае значэньне дзеля здабыцьця беларускае школы.

Калі ў тых мясцох, дзе падавалі дэкларацыі, школы беларускія да 1-га верасьня ня будуць адчынены, дык там таксама трэба падаваць дэкларацыі.

4) Валасныя рады і мястовыя магістраты, у каторых ёсьць сьвядомая беларуская большасьць, павінны вынясьці пастанову аб адчыненьні беларускіх школаў там, дзе насяленьне падало на беларускія школы дэкларацыі, а таксама і там, дзе дэкларацыяў не падавалі.

5) У тых валасных радах і магістратах, дзе няма сьвядомай беларускай большасьці, беларускія сябры іх няхай пастараюцца пераканаць іншых аб патрэбе гэтакай пастановы, а дзе ня можна дайсьці большасьці дзеля такой пастановы, няхай сьвядомыя беларускія сябры радаў і магістратаў ад сябе зробяць у іх заявы аб патрэбе адчыніць беларускія школы.

Гэтыя пастановы валасных радаў і мястовых магістратаў і заявы асобных сяброў ці групаў трэба прыслаць у Галоўную Управу Т-ва Беларускае Школы.

6) Усе беларусы на ўсіх вечах, зборках і паседжаньнях дамагайцеся пастановаў аб патрэбе адчыненьня беларускай школы. Нічога, калі Вам скажуць, што зборка „гэтым не займаецца“, бо бараніць дзеці ад калецтва чужой школай і дамагацца для іх здаровага развою ў сваёй роднай школе ўсюды ёсьць месца і час.

Усе гэтыя заявы й пастановы, адным словам — усе гэтыя дамаганьні беларускае школы будуць надрукаваны ў вялізнай кнізе ў беларускай і чужых мовах. Гэта зьверне ўвагу ўсяго сьвету на нашыя патрэбы, на нашае гора і несправядлівыя адносіны да нас.

Імёны тых беларусаў, што прыймуць удзел ў гэтай дзейнасьці, будуць запісаны ў гісторыі залатымі літарамі.

Зварочуемся да ўсіх беларускіх арганізацыяў і ўстановаў прылучыцца да гэтае нашае адозвы й акцыі, а ўсе краёвыя часопісі надрукаваць яе.

Галоўная Управа
Таварыства Беларускае Школы.

Вільня.

Справа Сакко і Ванцэтті.

Як спынена казьнь.

Казьнь Сакко і Ванцэтті адложана з 10.VIII на 22.VIII. За паўтары гадзіны перад выкананьнем прыгавору было абвешчана аб адкладзе. Засуджаныя, якія страцілі ўсялякую надзею, прынялі вестку аб гэтым з поўным супакоем — тым супакоем, які яны захоўвалі на працягу ўсёй кампаніі за іх вызваленьне.

Пастанова губэрнатара прышла зусім нечакана і выклікала надзвычайнае ўзварушаньне ў турме, якога не падзялялі толькі засуджаныя. Калі губэрнатар саззваў на пасьля абеда паседжаньне габінэту, лічыліся агулам з прыхільнай пастановай. Аднак, час мінуў, і, калі пачала зблізкацца апошняя гадзіна,—страціла надзею навет абарона. Жонка Сакко, якая з палкасьцю праклінала ўладу і крычала: „Я ім пад ногі кіну труп, хай толькі выдадуць мне яго! Мой жывы муж ёсьць той, каго я хачу“! якая дамагалася права, ня міласьці, рашыла наканец пасьць у ногі Фулеру. Аднак, адважная жанчына, якая сем гадоў змагалася за вызваленьне свайго мужа, не змагла пайсьці за міласьцяй і самлела ў вастрозе.

Засуджаныя разьвіталіся з прыяцелямі. Парыкмахер згаліў ім ужо голавы, каб лепш прымацаваць электрычны апарат, абрэзаў з тэй самай мэтай нагавіцы. Сакко бязупынна сланяўся па камэры. Ен быў за слабы, каб хадзіць. Ванцэтті не пераставаў пісаць лісты і чытаць. У гэты час зазьвінеў тэлефон з дому губэрнатара. Начальнік турмы паведаміў аб пастанове засуджаных і чакаўшую прэсу.

Раптам узьнясьліся сумлівы. Тэлефоннае паведамленьне магло быць жорсткім жартам, або адчайнай спробай вырваць ахвяры. І вось, не паслаўшы за падцьверджаньнем, начальнік турмы робіць самы жорсткі жарт: ён бярэ назад сваё паведамленьне.

У тысячах амэрыканскіх рэдакцыяў узьнялася нябывалая паніка; рыхтаваныя спэцыяльныя выданьні былі стрыманы, тэлефоны званілі бязустанку.

Наканец — пасьля далейшай мучыцельнай гадзіны — прышло ўрадовае пацьверджаньне. Усе вязьні, якія паразумяваліся перастуківаньнем, бурна ўзрадаваліся. Дэманстрацыі былі, аднак, спынены стаяўшымі ў карыдорах на варце дазорцамі. Толькі Сакко і Ванцэтті асталіся бязучаснымі. Яны пасьнулі.

Пастанова губэрнатара ўматывавана наступным чынам. Суды штата заняты разглядам гэтай справы, але суды ня маюць права прыпыніць выкананьне прыгавару. Дзеля гэтага губэрнатар на прапазыку пракурора і з згодай габінэту адкладае выкананьне прыгавору.

Як бачым з гэтага, магутны пратэст працоўных усяго сьвету зрабіў уплыў ня толькі на сваіх „радзімых“ капіталістаў, але прымусіў да адступленьня і зарваўшыхся амэрыканскіх. Пан губэрнатар, зацьвярдзіўшы прыгавор і вызначыўшы тэрмін выпаўненьня яго, ды адкінуўшы просьбу абароны аб адкладзе, — у апошні дзень, у апошнюю гадзіну — на прапазыцыю ўжо пракурора — адкладае казьнь **пакуль што**.

Дзеля таго, каб не дапусьціць да дэманстрацыяў перад турмой у гэту ноч, цэлыя вуліцы, што прылягаюць да турмы, былі абстаўлены паліцыяй, і навет жыхарам на гэтых вуліцах было забаронена выхадзіць з дамоў.

Праява страху буржуазіі.

Які страх ахапіў амэрыканскую буржуазію перад абурэньнем працоўных мас, якое яна сама выклікала, відаць з весткі, зьмешчанай у амэрыканскай газэце „Журналь оф Комэрс“. Паводлуг гэтай весткі, амэрыканскія капіталісты пачалі страхавацца ад разрухаў. Гэтая страхоўка па аблічэньню вельмі паважнага „Журналь оф Комэрс“ дадасягнула 1 мільярда даляраў (каля 9 мільярдаў злотых), пры чым на штат, у якім засуджаны Сакко і Ванцэтті, вышыня страхоўкі дасягае $1/2$ мільярда даляраў.

Вельмі характэрнай праявай гэтага страху амэрыканскай буржуазіі перад абурэньнем працоўных мас зьяўляюцца пратэсты і крокі лібэральнага крыла амэрыканскай буржуазіі, якое дагэтуль маўчала, як вады ў рот набраўшы. Так, сэнатар Бора зьбіраецца ўнесьці ў сэнат прапазыцыю аб апублікаваньні ўсіх дакумэнтаў міністэрства справядлівасьці да справы Сакко і Ванцэтті. Мала таго: страх перад абурэньнем працоўных мас дайшоў да таго, што —не паверыце!—у абарону Сакко і Ванцэтті сталі... амэрыканскія фашысты, выпусьціўшы адозву, у якой дамагаюцца справядлівага суда (яны)!?

Мае быць перагляд справы судом.

Вышэйшыя ўлады бацам маняцца прыхіліцца да дамаганьня абаронцаў Сакко і Ванцэтті й аддаць справу на новы разгляд новаму складу суда. Абаронцы трэбуюць: 1) скасаваньня прысуду, 2) распачацьця новага працэсу і 3) выключэньня з складу суда 2 судзьдзяў, ведамых сваей староннасьцю.

Сакко галадаў 25 дзён.

11-га жніўня скончыўся 25 дзень, як Сакко распачаў галадоўку, каб зьвярнуць увагу на несправядлівы прысуд. Ен пастанавіў ня спыняць галадоўкі, пакуль ня будзе скасаваны прысуд ды не назначаць новага разгляду справы.

Голас нямецкага юрыста.

Вельмі ўдалую характэрыстыку і асьвятленьне справы Сакко і Ванцэтті дае былы прускі міністар справядлівасьці ў сваім ар-

тыкуле, зьмешчаным у „Бэрлінэр Тагебляце“. Вось некалькі выемак з вялікага артыкулу Вольфганга Гайнэ:

„Тое, што чуваць аб складзе суда, аб зьбіраньні абцяжаючага матэрыялу і заціраньні матэрыялаў, спрыяючых засуджаным, ды аб націску на справу ўплывовых палітычных і эканамічных праціўнікаў іх праз бяссумленную прэсу,—гэта ўсё мае, на жаль, шмат праўдападобнасьці, калі прыняць пад увагу ўсё тое, аб чым паведамлялася ў падобных працэсах у Амэрыцы“.

Крыху далей ён кажа:

„Пэўна, што тэрарызм, які кіруецца проці безбароннага жыхарства, які бязьвінных людзей у цэрквах і на вагзалах разрывае на часьці, зьяўляецца вар'яцтвам. Ен яшчэ дурнейшы і агіднейшы, калі робіцца прапаведнікамі свабоды і чалавечнасьці“. „Аднак, можа як-раз і хочуць выклікаць гэтыя праступленьні (абвініцелі Сакко і Ванцэтті), спэкулюючы на абурэньні, якое гэта распаліць. Ці прыпамінаеце вы сабе, што кіданьне ў 1921 г. бомб у кінах Міляна дапамагло Мусоліні засцаваць сваё панаваньне? Ці й тут не спадзяюцца падобнага? Калі так, то тады выкананьне прысуду будзе судовым душагубствам. Усё-роўна, ці Сакко і Ванцэтті віноўны або ня віноўны, але тое, што цяпер хочуць паслаць іх на эшафот і выклікаць усе тыя насьледкі, якія гэта можа пацягнуць за сабой,—гэта можна **толькі зразумець, як уплыў палітычных матываў, клясавай нянавісьці і яшчэ больш клясавага страху** (падкрэсьлена ў арыгінале), калі не халоднага жорсткага выхаваньня“.

„Ніхто ня можа сумлявацца, што пастанова выканаць прысуд сьмерці выкліча тэрорыстычныя акты з боку анархістаў“.

Зусім згаджаючыся з агульнымі вывадамі прускага юрыста, ад сябе мусім заўважыць, што ён памыляецца, прыпісываючы анархістам кіданьне цяпер бомб у тунэлях і на вагзалах чыгунак, якія могуць пашкодзіць толькі безбароннаму жыхарству. Анархісты гэткага тэрору не прызнаюць. Яны прызнаюць тэрор, але на выдатныя асобы і ўстановы буржуазіі. З увагі на гэта можна з поўнай пэўнасьцю сказаць, што вышэй адзначаныя выпадкі ў Амэрыцы, а таксама і факты з 1921 г. у Мілане, зьяўляюцца ня дзеяньнямі анархістаў, а тых, каму залежыць на тым, каб гэткімі дзеяньнямі, прыпісанымі анархістам, узбурыць проці іх, а разам з тым і проці ўсіх іншых змагароў за вызваленьне працоўных, шырокія масы. Гэтыя справы робіць той, каму гэта дае карысьць,—знача, буржуазія і яе агенты.

Гэтыя нашыя ўвагі не аслабляюць, а, наадварот, узмацняюць агульныя вывады Вольфганга Гайнэ.

200 тыс. работнікаў бастуе ў Нью-Іорку.

У Нью-Іорку пасьля мітынгу, сабраўшага 100 тыс. асоб, забаставала 200 тыс. работнікаў, дамагаючыся звальненьня вязьняў.

Масавыя арышты дэманстрантаў.

У Амэрыцы падняўся такі рух сярод працоўных, што паліцыя ледзь пасьпявае рабіць арышты. Так настрашана буржуазія гэтым магутным рухам, што баіцца навет простых дэманстрацыяў.

Прыступаюць ад пагроз да дзела.

У папярэднім нумары мы ўжо паведамлялі аб пагрозах высокага ўрадоўца, скіраваных да работнікаў, якія ня маюць правоў амэрыканскага грамадзянства. Тым пагражаецца стратай права на атрыманьне грамадзянства і высылкай за прыняцце ўчасьця ў мітынгах, дэманстрацыях і забастоўках з прычыны справы Сакко і Ванцэтті.

Пастулак гэтага ўрадоўца мы назвалі хамствам і зьдзічэньнем, але цяпер падыходзяць вельмі цікавыя весткі ўжо аб кроках амэрыканскага ураду. Так, міністар працы Даўэс запрапанаваў усім прадпрыемцам праверыць, ці іх работнікі жывуць у Амэрыцы легальна, ці не. „Національ Індустрыаль Конціль“, які налічае сябрамі 75 тысяч прадпрыемцаў, дало адказ, што яно ахвотна будзе дапамагаць у выяўленьні нелегальна прыехаўшых сярод наіманых імі работнікаў.

Само-сабой разумеецца, дзеля чаго гэта робіцца, але цікава і вельмі характэрна афіцыяльнае абгрунтаваньне гэтага мерапрыемства. Вось-жа тлумачыцца яно „нарастаючымі знакамі безрабоцьця, што робіць пажаданым трымацца сьцісла закону аб іміграцыі і не дапускаць да перавышэньня кантынгенту“ (вызначанае наперад лічбы). А далей „Уорльд“ заяўляе, што некалькі разоў ужо падыманы плян рэгістрацыі чужаземцаў у асобныя сьпіскі з адбіваньнем пальцаў урад толькі тады правядзе, калі не памогуць цяперашнія меры дзеля выдаленьня радыкальных агітатараў. Аказываецца, міністэрства справядлівасьці прыгатавала з ранейшых повадаў сьпіс, у якім зьмешчана 200 тысяч асоб, якія ўрад хоча выкінуць з Амэрыкі за іх палітычныя перакананьні.

Дэманстрацыі і мітынгі па ўсім сьвеце.

Па ўсім сьвеце ня спыняюцца мітынгі й дэманстрацыі — проці казьні нявінных ахвяр буржуазнага суда ў Амэрыцы.

Рымскі папа ня цікавіцца справай Сакко і Ванцэтті.

Сам навет Мусоліні заявіў, што ён зрабіў усё, што толькі дазваляе міжнародавае права і дыпляматычныя звычаі, каб ратаваць жыцьцё двум італьянцам, якія несправядліва засуджаны на сьмерць амэрыканскім судом. А вось, з Ватыкану запярэчываюць афіцыяльна вестцы, быццам папа асабіста зьвярнуўся да Вашынгтонскага ўраду, просячы аб дараваньні жыцьця абодвум няшчасным вязьням... Толькі амэрыканскія кардыналы далучыліся да сусьветнай акцыі на карысьць Сакко і Ванцэтті.

Заява апазіцыі у Кам. Партыі.

У Маскве адбыліся важныя нарады Цэнтральнага Камітэту і Цэнтральнае Кантрольнае Камісіі Камуністычнае Партыі. Пасьля дыскусіі апазіцыя зрабіла вельмі важную заяву. Апазіцыя сьцьвярдзіла, што яна і далей стаіць на становішчы абароны сацыялістычнае Бацькаўшчыны ад імпэрыялістычнага замаху і згаджаецца прымаць учасьце ў гэтай абароне супольне з цяперашнім складам Цэнтральнага Камітэту, захоўваючы сабе права крытыкі дзеяльнасьці яго. Апазіцыя заяўляе, што рашуча адкідае прыпісаную ей думку аб імкненьні да ўтварэньня асобнае партыі, бо лічыць, што гэта магло-б давясьці да катастрофы СССР. Апазіцыя бясспрэчна падпарадкуецца ўсім пастановам Ц. К. Партыі.

Група апазіцыянераў на нарадах была прэдстаўлена ў асобах Троцкага, Зіновьева, Евдокімова, Каменева і Пятакова.

Як падгатаўляецца новая вайна.

Навакол справы аканчальнага вызваленьня Нямеччыны з пад зялезнага бота „былых пераможцаў“ групуюцца ў Эўропе, здаецца, усе палітычныя падзеі апошняга часу. Справа ў тым, што нямецкі ўрад рашуча заявіў, што, маючы ў кішані квіток Антанты, што Нямеччына выпаўніла ўсе варункі разбраеньня, пастаўленыя ей Трактатам, ён на найбліжэйшай сэсіі Лігі маніцца рубам паставіць і справу скасаваньня акупацыі... Гэтая заява, зробленая нейкім „новым голасам“, якому асаблівую сілу дадае, як ведама, Рапальскі Трактат з Радамі, зрабіла, зразумела, вялізарны перапалох перадусім у колах францускіх мілітарыстаў, якія за ўсялякую цану хочуць яшчэ трымаць Нямеччыну на зялезным ланцугу акупацыі... Для Нямеччыны стварылася палажэньне вельмі цяжкае ды супярэчнае: запраўды-ж, каб мець **юрыдычнае права** трэбаваць скасаваньня акупацыі яна павінна разброіцца; але вось, каб запраўды скарыстаць з гэтага права на дзеле, Нямечына павінна м-**ць фактычную ваенную сілу**, каб пагрозай аружнага ўсенароднага руху і пратэсту змусіць францускіх мілітарыстаў, якія лічацца толькі з сілай, да скасаваньня акупацыі, якая цяпер ужо пачынае дражніць нямецкі народ, правакуючы яго на неаблічаныя рэчы...

Як бачым, палажэньне стварылася такое, што з яго хутка і рашуча трэба знайсьці выхад, бо яно пагражае выбухам, задушыць які будзе пасьля вельмі цяжка... Як знак набліжэньня буры, пачалася страшэнна вострая кампанія ў прэсе—францускай і нямецкай. Француская прэса і зьвязаная з ёй бэльгійская зьмяшчаюць у апошнія часы вялізарную масу заяваў аб выкрываных тайных збраеньнях Нямеччыны, якая быццам бяссумліўна рыхтуецца да вайны. Адзін па адным францускія і бэльгійскія генаралы і міністры ды розныя „пацыфісты“ публікуюць вусна і ў газэтах „дакумэнты“ аб гэтых збраеньнях Нямеччыны. Толькі-што была ўзьнялася вострая спрэчка між ваенным міністрам Бэльгіі і нямецкім урадам з прычыны апублікаваньня ў парляманцкай прамове гэтага міністра „дакумэнтаў“, здабытых, як прызнаў сам міністар, шляхам ваеннага шпіянажу... Ледзь заціх неяк гэты канфлікт, як раптам надрукаваны ў папулярнай парыжскай газэце сэнсацыйны тайны даклад—яшчэ больш „бесстароннага“ фахоўца, бо самаго Галоўнага Камандзіра ўсей францускай акупацыйнай арміі ў Надрэніі ген. Гійома,—прысланы быццам ім ваеннаму міністру Пэнлевэ. У гэтым „дакладзе“ ген. Гійома (якому, як і шмат каму з яго падуладных, пэўна-ж шкада страціць цёплыя ды сытныя пасады й вялізарныя пэнсіі, спаганяныя з нямецкага народу!) рысуе тыя страшэнныя небясьпекі, якія нарастаюць навакол акупацыйнай тэрыторыі ды пагражаюць выбухам і на гэтай апошняй... Але — замест таго, каб зрабіць з гэтага адзіны разумны, справядлівы ды людзкі вывад, адважны генарал, зразумела, трэбуе асаблівых ваенных мераў проці Нямеччыны, якая яўна „рыхтуецца да вайны“.

Так з францускага боку падрыхтоўваецца „дыпляматычныя дуэль“ з нямецкім урадам на найбліжэйшай сэсіі Лігі Народаў—у справе акупацыі...

Ясна ўсім, што цяпер ідзе дурная ды праступная ігра з агнём у складзе пораху... Калі ня знойдзецца сярод дзяржаваў Антанты якая разумная галава, якая-б астудзіла гарачку ў галовах францускіх мілітарыстаў, дык справа можа скончыцца дрэнна.

Трэба прызнаць, што Нямеччына адзначанымі вышэй варункамі змушана быць (— і зусім ня крые, што яна хоча быць!) — мілітарна сільнай, каб мець фактычную магчымасьць выконываць свае правы на дзеле. Нямеччына трэбуе законнай роўнасьці для сябе, як паўнапраўнага сябры Лігі Народаў. Калі разбраеньне, дык — добра: будзем разброівацца ўсе. А згадзіцца на тое, каб быць разброенай аднэй—сярод азброеных да зубоў суседзяў, гэта,—перапрашаем,—і недарэчна, і мы папросту гэтага больш цярпець ня хочам...

Дык і выходзіць, запраўды-ж, так, што Нямеччына патрапіла знайсьці такі спрытны выхад з палажэньня: і выканаўшы ўсе абавязкі разбраеньня, узложаныя на яе трактатам, яна пасьля ўсёж-такі здолела стварыць у сябе такую фактычную мілітарную сілу ў народзе, якая ўжо не **баіцца зялезнага бота Антанты...**

Вось, як фактычна стаіць справа, якая так страшэнна абурае ўсіх францускіх мілітарыстаў, разумеючых, што іх панаваньню над Нямеччынай, дый наагул у Эўропе, — прыходзіць канец..

Тайны саюз Вэнгрыі з Італіяй.

Газэты пішуць, быццам Мусоліні з вэнгерскім прэм'ерам Бэтленам падпісалі тайны дагавор, на падставе якога Італія мае дапамагчы Вэнгрыі вярнуць частку адабраных у яе—паводле мірнага трактату — зямель; а за гэта Вэнгрыя абяцала падтрымаць Італію на выпадак вайны з Югаславіяй — за Альбанію.

Наагул цяпер справа Вэнгрыі пачала зварачаць на сябе ўвагу. Справа ў тым, што Вэнгрыя, як і ўсе пераможаныя ды парэзаныя Вэрсальскім Трактатам і яго „дачкамі“ (паасобныя дадатковыя трактаты, аб Югаславіі, Вэнгрыі, Аўстрыі і Баўгарыі былі падпісаны ў розных іншых, такіх-жа, як і Вэрсаль, маленькіх мястэчках пад Парыжам) страшэнна нездаволена створаным для яе палажэньнем і імкнецца да зьмены яго. Але, ня маючы магчымасьці абаперціся—падобна Турцыі і Нямеччыне — на вольны ад усялякіх вэрсальскіх путаў Радавы Саюз ды націскаць на сучасных камандзіраў вэрсальскай Эўропы сілай ці страхам аружжа, Вэнгрыя, акружаная з усіх бакоў „жандармамі Антанты“, стараецца выкарыстаць толькі пакінутыя ёй дыпляматычныя шляхі вызваленьня, ды гэтымі шляхамі імкнецца да „адбудовы свайго даваеннага палажэньня“.

Карыстаючыся з панаваньня фашызму ці паўфашызму ў кіруючых дзяржавах сучаснай Эўропы, вэнгерскі фашызм стараецца якраз на гэтым зрабіць для Вэнгрыі добры „гешафт“. Як спрытна вэнгерскі ўрад выкарыстоўвае заінтэрэсаваную у саюзе з Вэнгрыяй Італію, мы ўжо ведаем. Але ў апошні час раптам выявілася вонках даўно распачатая вэнгерская агітацыя ў Англіі.

З вельмі рэзкімі напасьцямі на крыўды для Вэнгрыі міравы трактат (Трыянонскі) выступіў нядаўна вельмі ўплывовы англійскі палітык-публіцыст лёрд Ротэрмэр, які трымае ў сваіх руках, як выдавец, амаль не палову англійскіх газэт. Гэты „газэтны кароль“ у Англіі, маючы вялікі ўплыў на англійскі ўрад, апрача кампаніі ў сваіх газэтах на карысьць перагляду Трыянонскага Трактату, зьвярнуўся з радам адкрытых пісьмаў да чэхаславацкага міністра Бэнэша — вельмі рэзкага зьместу, закідаючы чэскаму ўраду ўціск вэнгерскай меншасьці і трэбуючы **перагляду вэнгерска-чэхаславацкіх граніцаў.**

Гэтыя лісты англійскага адваката Вэнгрыі зрабілі вялізарную сэнсацыю—ня толькі ў Чэхаславакіі, але і ўва ўсей Вэрсальскай Эўропе, якая горш, чым сьмерці, баіцца ўсялякага перагляду існуючага „ладу“ дый усіх тых „трактатаў“, на якіх яна ледзь трымаецца ў нястойкай раўнавазе. Бэнэш таксама вельмі востра і ядавіта адказаў англійскаму пратэктатару Вэнгрыі, дадаўшы, што, каб ня быў міністрам дыпляматам, дык адказаў бы й ня так яшчэ...

Трэба прызнаць, што дамаганьні Вэнгрыі ў пэўнай частцы маюць слушнасьць, але хутчэй—скіраваныя ў бок Румыніі, чым Чэхаславакіі. Бо Румыніі запраўды нарэзалі больш чыста вэнгерскіх этнаграфічна зямель, дый румынскі фашызм душыць свае меншасьці без прыраўнаньня горш, як у культурна-стрыманай Чэхаславакіі яе ўрад. Дык вось, якраз у гэтым і горкі лёс вэнгерскіх дамаганьняў: вэнгерскі фашызм хоча вярнуць сабе ня толькі этнаграфічна вэнгерскія землі, але і ўсіх тых славянаў, якія раней уваходзілі ў склад „кароны сьв. Сьцяпана“ і якіх вэнгерскі магнацкі ўрад — пад гэтай „каронай“ — заўсёды душыў перад вайной так, што аб гэтым па сягоньняшні дзень жыве крывавая памяць ненавісьці. Дык усе гэтыя славянскія народы на былых землях Вэнгрыі, ведаючы, што ўваскросшы магнацкі лад у Вэнгрыі прыняў яшчэ больш агідныя, крывавыя формы сучаснага фашызму, скіраванага проці працоўных сялянска-работніцкіх масаў,—рашуча заявілі, што ня хочуць варочацца пад гэтую „карону сьв. Сьцяпана“, якая датаго ж мае быць яшчэ й начэплена на маючага быць „адбудаваным“ вэнгерскага караля з Габсбургскай дынастыі... Дык вось, міністру Чэхаславацкай Рэспублікі, дзе гэтым былым вэнгерскім слявянам (славакам) і ўкраінцам, жывецца лепш, чым было пад Вэнгрыяй, даволі было — у адказ на дамаганьне Вэнгрыі ды яе англійскага адваката—пазвацца толькі на голас гэтых самых славакаў і ўкраінцаў. Усе яны, як ні востра выступаюць іх паасобныя групы проці ўрадавай палітыкі Чэхаславакіі, усё ж ніколі ня згодзяцца рэспубліканскі лад Чэхаславакіі замяніць на—крывава-тэрорыстычны магнацка фашыстаўскі „лад“ Вэнгрыі.

Дык ясна, што вэнгерская дыпляматыя навет у сучаснай фашыстаўскай Эўропе нічога зрабіць ня зможа.

Раскол сярод Амстэрдамскага Прафэсыянальнага Інтэрнацыяналу.

На адбытым толькі-што ў Парыжу кангрэсе II Інтэрнацыяналу Прафэс. Саюзаў выявіліся рэзкія разыходжаньні паміж павадырамі саюзаў кантынэнтальных дзяржаваў Эўропы (на сухапуцьці) і прадстаўнікамі англійскіх Трэд Юніёнаў (Праф. Саюзаў). Разыходжаньні ў працягу кангрэсу разьвярнуліся ў рашучы раскол, які так і астаўся незалатаным рэзалюцыямі кангрэсу. Англійскія аб'яднаныя работнікі стаялі — проці амаль ня ўсей Эўропы („сацыялістычнай“, зразумела!) —за **адзін фронт з Праф Саюзамі СССР**. У часе спрэчак дайшло да вельмі вострых сутычак паміж павадырамі абедзьвюх групаў—на чале з старшынёй II Інтэрнац. тав. Пэрсэлем (англійцам) і тав. Жуо (французам). Генаральны Сэкрэтар II Інтэрнацыяналу, абураны нападкамі з боку англійцаў — за ламаньне адзінага работніцкага фронту, заявіў, што выходзіць у адстаўку. З другога боку, большасьць кангрэсу ня выбрала навет у яго Цэнтральны Камітэт (Бюро) былага старшыню Пэрсэля, ня глядзячы на тое, што англійская дэлегацыя ставіла гэта, як варунак свайго супрацоўніцтва ў Інтэрнацыянале...

Як далей пойдзе гэтае супрацоўніцтва, няведама. У кожным разе — цікаўная гэтая стойкасьць англійскіх работнікаў, асабліва пры тэй ваяўнічасьці проці СССР, якую выяўляе адкрыта англійскі буржуазны ўрад... Вось — галоўная прычына таго, што Англія ня можа аружна накінуцца на СССР, чаго так хочацца яе буржуазіі.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Сэнсацыйная вестка.

Газэты зьмясьцілі сэнсацыйную вестку, быццам група віленскіх „палітыкаў“, мае выехаць у Коўну — дзеля перагавораў з прадстаўнікамі літоўскіх „людоўцаў“, — у справе паразуменьня Літвы з Польшчай... Ці не стаіць гэта ў сувязі з нядаўнай візытай у Вільні марш. Пілсудскага?!

Забастоўка трамвайных служачых у Лодзі.

Некалькі дзён назад пачалася забастоўка служачых трамваю ў Лодзі. Ані адна, ані другая старана ня ўступала. Каб давясьці да паразуменьня і канца забастоўкі, у канфлікт умяшалася—па просьбе работнікаў—міністэрства працы. Работнікі галоўным чынам абураюцца на дамаганьне з боку дырэкцыі трамваяў захаваць сабе права звальняць работнікаў „без тлумачаньня прычынаў“, дый—за ўчасьце ў „беспадстаўнай забастоўцы“... У нарадзе з прадстаўнікамі міністэрства гэтыя агідныя дамаганьні былі скасаваны, і цяпер міністэрства мае быццам націснуць на дырэкцыю, каб прыняла новы праект паразуменьня.

У апошні мамэнт высьвяецца, што забастоўка трамвайных служачых у Лодзі скончылася поўнай перамогай баставаўшых. Праўленьне трамваяў згадзілася вярнуць на службу звольненых работнікаў ды павялічыць плату ўсім на 25 прац. (на чацьвертую частку істнуючых пэнсіяў).

„Самаўрадавая Рада“.

12 жніўня віцэ-міністар унутраных спраў адчыніў урачыста першае паседжаньне новастворанай урадам „Самаўрадавай Рады“. У лічбе іншых „Радаў“, якімі ўрад марш. Пілсудскага неяк маніцца „заступіць“ ненавісны яму парлямант, „Самаўрадавая Рада“ мае апрацоўваць „законадарадчым парадкам“ для ўраду праекты самаўрадавых дэкрэтаў, разглядаць спорныя пытаньні ў галіне самаўрадавага жыцьця ды інш...

Шляхам францускіх манархістаў.

Польская прэса падае гэткую — проста непадобную да веры вестку.

Эндэцкі генарал Загурскі, які больш году сядзеў у віленскім ваенным вастрозе—па абвіненьню ў розных „хабарных справах“, раптам—шляхом вельмі дасьціпнага „фігля“ —уцёк з турмы і зьнікнуў зусім бяз сьледу. Пэўна-ж, што генарал, у якога, як кажуць расейцы, „рыла добра ў пуху“,—сядзіць сабе ўжо даўно заграніцай ды сьмяецца з сваіх няўдалых ахоўцаў...

Спосаб, якім палітычныя прыяцелі генарала Загурскага вызвалі яго з пад цяжкай лапы накрыўшай яго Нэмэзіды (грэцкая багіня справядлівасьці), зусім падобны да таго, якога ўжылі францускія манархісты — дзеля ўратаваньня з рук правасудзьдзя свайго павадыра—Додэ. Так прынамся кажа „Ілюстраваны Кур. Краковскі“. Ен кажа, што ў Віленскі ваенны вастрог зьявіліся тры афіцэры ды прадставілі загад ваеннага пракурора п. Качмарка аб выдачы генарала Загурскага ім на рукі. Камэндант вастрогу выдаў ім генарала. А калі на другі дзень затэлеграфаваў аб гэтым у Варшаву да міністэрства, дык там вестка аб выпушчэньні генарала выклікала ўзварушэньне („шалёнэ порушэне“), бо міністэрства зусім ня зьбіралася быццам у бліжэйшы час выпускаць генарала з вастрогу ці перавадзіць у варшаўскую турму. Тым больш, што якраз толькі-што выкрыліся новыя вялізарныя надужыцьці слаўнага эндэцкага генарала: францускія самалётныя фірмы прызналіся, што далі яму больш за 600 тысяч франкаў „лапувэк“ (хабараў). Быццам за ўцечку генарала арыштаваны камэндант віленскай турмы і адзін з дыжурных афіцэраў...

Хатняя вайна у Кітаі.

Ці рашучае паражэньне Чанг-Кай-Шэка?

Ужо некалькі дзён, як ідзе страшэнная, можа, генеральная ды канчальная бітва—на даўжэнным фроньце — паміж войскамі абодвух Чангаў—паўдзённага і паўночнага. Але ўжо перавага рашуча перахілілася на бок Чанг-Тсо Ліна. Апошнія весткі кажуць навет аб тым, што кавалерыя апошняга прарвала фронт арміяў Чанг-Кай Шэка ды зайшла ім у тыл... А гэта значыць, што хутка яны—пабягуць, як зайцы, назад...

Наскелькі катастрафічнае палажэньне Чанг-Кай Шэка, ясна з таго, што ён ужо пачаў эвакуацыю сваей „сталіцы" Нанкіна. З гэтага відаць і тое, што мэтай апэрыцыяў Чанг Тсо-Ліна зьяўляецца здабыцьцё Нанкіна і Шанхаю. Маючы магутную дый—трэба думаць—зусім ужо адкрытую дапамогу з боку Японіі, здабыцьцё гэтых галоўных для Чанг-Кай-Шэка цэнтраў, ня будзе цяжка для Чанг-Тсо Ліна: японскі флёт можа аж надта аблягчыць гэтую задачу...

Як крылоўскі млынар, Чанг-Кай-Шэк, маючы перад сабой прарваную грэблю свайго млына, тым больш злосна пачаў біць „камуністычных куранят" у Хан Коў, ды дзе інш. Адна, відаць, толькі гэтая пацеха і асталася няўдаламу „галоўнаму камандзіру ўсіх войскаў аб'яднанага Кітаю", якім ён амаль не зрабіўся, дзякуючы сваей перамозе над паўночнымі арміямі.

Чанг Кай-Шэк ранены.

З Шанхаю даносяць, быццам Чанг-Кай Шэк ранены куляй, з карабіна. Пакуль-што далейшых вестак ды пацьверджаньня гэтай весткі няма...

Гэткі канец так сама можна было прадбачыць: куля магла прысьці—як з боку ашуканага ды здраджанага народу, так і з боку тых, для каго рабіў Чанг-Кай Шэк гэтую здраду.—Бо-ж дзеля апошніх, чым больш у краі безгалоўя,—тым лепш...

Сэнсацыйная чутка — аб „канцы Чанг-Кай-Шэка"...

Весткі з Лёндану кажуць, што рашучы бой Чанг Кай Шэка з Чанг-Тсо Лінам (і з японскімі войскамі...) скончыўся катастрофай для паўдзённых арміяў... Чанг Кай-Шэк навет кінуў быццам сваю армію дый неспадзявана прыехаў у Шанхай у кампаніі з некалькімі вышэйшымі генераламі. Весткі кажуць аб тым, што арміі Чанг Кай-Шэка пачалі разваліваіца—таксама, як толькі-што разваліваліся арміі Чанг Тсо Ліна... Цэлыя вялізарныя часьці войскаў першага пераходзяць на бок апошняга. Чанг-Тсо Лін стаіць ужо пад самым Нанкінам, сталіцай і былай галоўнай кватэрай Чанг-Кай-Шэка... Войскі Чанг-Тсо-Ліна занялі амаль не цалком паўночны бераг Ян-Тсэ Кіянга.

Апошняя вестка—запраўды ж сэнсацыйная: з Шанхаю англійскія крыніцы перадаюць, быццам Чанг-Кай Шэк заявіў, што ён—ня толькі адмовіўся ад галоўнага камандаваньня паўдзённай арміяй, але і зусім адыходзіць ад усялякай палітычнай дзеяльнасьці...

Англійцы могуць трыўмфаваць цалком: іх найміт зрабіў свае дзела, дык можа адыйсьці... Аб трыўмфе Японіі дык і няма што казаць...

Газэты зьмяшчаюць і афіцыяльны камунікат у справе ўцёкаў слаўнага польскага „паветранага генерала". Ген. Загурскі быў прывезены, быццам запраўды па загаду пракурора ў Варшаву, дзе меў быць, пасьля „рапарту" ў марш. Пілсудскага, звольнены з вастрогу да суда. Але, відаць, генерал Загурскі ведаў свае грахі лепш, як яго пракуроры,—бо, прыехаўшы ў Варшаву, не заехаў быццам навет дамоў да сям'і, але, папрасіўшыся ў прывезшых яго афіцэраў у лазьню, зьнік—бяз сьледу. Праждаўшы яго 3 дні „до рапорту", марш. Пілсудскі загадаў шукаць яго, як дэзэртыра...

Цікаўна, што эндэцкая прэса й сама ня ведае, што рабіць: ці радавацца, што яе „богатэр" уцёк жывы заграніцу, ці—скардзіцца на ўвесь сьвет, што яго — „упяклі" прыхільнікі марш. Пілсудскага, схаваўшы ўсе канцы ў воду.

Куды ўцёк ген. Загурскі?

Газэты пішуць, што ўжо раскрылася, што слаўны аўстрыяцкі шпіён (над польскім афіцэрамі ў аўстрыцкай арміі) ды эндэцкі „богатэр", які, папаў у вастрог за стотысячныя „лапувкі", былы шэф польскай авіяцыі, ген. Загурскі, — уцёк праз Гданск за граніцу. Гэта сцьвярдзіў рэдактар польскай газэты ў Катовіцах, які бачыў яго па дарозе на станцыі.

„Сьледчыя судзьдзі для справаў вынятковай вагі".

У апошнім нумары „Дзен. Устав." апублікаваны дэкрэт п. Прэзыдэнта—аб „сьледчых судзьдзях для справаў асаблівай вагі". Гэткія асабліва важныя сьледчыя" будуць назначаны Прэзыдэнтам—па прапазыцыі Рады Міністраў—у местах, дзе іх патрэбу прызнае міністар справядлівасьці. Кандыдаты на гэткіх сьледчых будуць выбірацца толькі сярод дазнаных судзьдзяў ці пракурораў, якія ня менш за 5 гадоў праслужылі ў судзе.

Яшчэ „шпіёнская банда" — ў Львове і Перамышлю.

Газэты пішуць, што дэфэнзыве ўдалося выкрыць і зьліквідаваць новую „шпіёнскую афэру", працаваўшую—на карысьць суседняй дзяржавы (Нямеччыны?)—на тэрыторыі львоўскага і перамышльскага карпусоў.

У рукі ўладау папала быццам маса кампрамітуючага матэрыялу: справаздачаў шпіёнскай агентуры, прыгатаваных ужо да адсылкі ў штаб суседняй дзяржавы, копіяў пляну розных вайсковых прыладаў, рысункаў і плянаў крэпасьцяў, плянаў раскладу войск і г. д. Вобыскі ў розных асобаў выкрылі значныя сумы даляраў, якія быццам атрыманы з-заграніцы. Усяго арыштаваны звыш 20 асобаў вайсковых і цывільных, жыхараў ваколіц Львова і Перамышля, а так сама — жаўнераў сапэрскага палка, што стаіць у крэпасьці Перамышль.

Заграніцай.

Вялікія манеўры літоўскай арміі—на польскай граніцы.

На польскай граніцы пачаліся вялікія манэўры літоўскай арміі. Як заўсёды, заданьне літоўскай арміі—„узяць Вільню". Першы корпус „ідзе на Вільню з боку Сьвянцян". Дывізія пяхоты павінна фарсаваць Вільлю, ідучы на Вільню. У той самы час брыгада кавалерыі будзе перарэзваць чыгункавую лінію Вільня — Горадня, каб спыніць падвоз падмогі з Варшаўшчыны...

„Польскую армію" мае йграць на манэўрах 5 дывізія пяхоты.

На манэўры запрошаны ваенныя агенты ўсіх маючых дыпляматычныя зносіны з Літвой дзяржаваў.

Праф. Гэрбачэўскі высланы з Літвы.

Газэты падаюць спрэчныя весткі аб тым, дзе падзеўся праф. Гэрбачэўскі, які — „з даручэньня прэм. Вальдэмараса", як ён казаў ды пісаў у Варшаве,—прыехаў быў у Польшчу „рабіць паразуменьне". — Пішуць, быццам, вярнуўшыся ў Коўну, ён зараз жа быў высланы з краю, як наперад пагражалі літоўскія газэты. Іншыя ізноў пярэчаць гэтай вестцы.

Далейшае збліжэньне Латвіі з ССРР.

Як ведама, латвійска радавы дагавор аб узаемным ненападаньні быў у сваім часе апрацаваны і падпісаны ўмоўна — да аканчальнае згоды дагаварываўшыхся ўрадаў. У мінулы чацьвер, ня гледзячы на ўсе стараньні Англіі перашкодзіць падпісаньню гэтага дагавору, ён усё ж такі быў падпісаны аканчальна.

Гэта — у сувязі з узнаўленьнем актыўнасьці радавае дыпляматыі на Захадзе — новая перамога Радавае палітыкі над Англіяй.

Чарговы варожы акт англійскага ўраду проці насяленьня ССРР.

Лёнданскае агенцтва пахваляецца тым, што Англійскі Банк (дзяржаўны) зьвярнуўся з агульным лістом да ўсіх прыватных банкаў Вялікабрытаніі, прапануючы ім (ведама-ж, пад пагрозай пазбавіць іх крэдытаў)—устрымацца ад усялякага фінансаваньня вывазу збожжа з ССРР. Англійскія палітыкі перакананы, што гэты крок будзе забойчым для радавай заграннічнай таргоўлі дый падарве яе яшчэ больш, чым тая „нафтавая блёкада", якую трымаюць навакол ССРР англійскія нафтавыя кампаніі.

Пэўна ж, што гэты людаедзкі загад англійскіх капіталістаў удэрыць па таргоўлі ССРР, але ўдэрыць таксама і па тых мільёнах спажыўцаў паза-межамі ССРР, якія патрабуюць прывозу ў свой край радавага хлеба. Удэрыць і па англійскіх работніках, падняўшы дарагоўлю хлеба ў краі.

Зьмена ў складзе Рады Лігі Народаў.

Англійскае тэлеграфнае агенцтва „даведалася" аб тым, што Агульны Збор Лігі Народаў мае на верасьнёвым сходзе выбраць у Раду замест Чэха-Славакіі — Фінляндыю, бо мандат Чэха-Славакіі канчаецца якраз у гэтым годзе.

„Недзяржаўным" народам можна толькі радавацца з прычыны гэткай зьмены. Бо-ж п. Бэнэш, як толькі пачаў вясьці новую палітыку прыязьні і паразуменьня з Польшчай, дык настолькі „заразіўся польскай хваробай", што ня толькі перастаў бараніць справы меншасьцяў, як дагэтуль, але і ў сябе ў Чэха Славакіі пачаў у значнай меры тасаваць „польскую палітыку" адносна да сваіх меншасьцяў. Наадварот, Фінляндыя, ня маючы зусім ніякіх меншасьцяў, — побач з іншымі Скандынаўскімі краямі належыць у Лізе Народаў да „нямецкай"—апазіцыйнай—групы, якая вядзе ў Лізе лінію запраўднай, паскольку гэта магчыма ў гэтай Лізе!—роўнасьці народаў, дый зьяўляецца ў Лізе найбольш шчырым ахоўцам ды абаронцам „недзяржаўных народаў" і нацыянальных меншасьцяў, уціснаных рознымі „прыраджонымі гаспадарамі".

Новы арышт камуністычнага пасла у Францыі.

Яшчэ адзін камуністычны пасол—Марті — арыштаваны пасьля прамовы на мітынгу ў правінцыяльным месьце (трэба думаць — у яго выбарным вокрузе).

Новая гульня ў „рэвалюцыю" ў Партугаліі.

У Партугаліі — чарговая гульня ў „рэвалюцыю". Некалькі афіцэраў ўварваліся у габінэт прэм'ера і пад пагрозай рэвальвэраў спрабавалі змусіць яго, каб падпісаў „загад аб сваей адстаўцы". Другая „пачка" напала на дырэктара дзяржаўнай друкарні, каб той надрукаваў загад аб адстаўцы ўраду. У той-жа час іншыя „замахоўцы" прабавалі збунтаваць проці ўраду сталічныя палкі, але, як піша камунікат ураду,—няўдатна. Усе гэтыя „рэвалюцыянеры" ўжо арыштаваны. Аднак-жа ўрад падцягнуў у сталіцу верныя яму палкі... Наскольні верныя, пачакаем яшчэ судзіць аканчальна.

„Скасаваньне" цэнзуры ў Румыніі.

Як ведама, пасьля сьмерці румынскага караля ўрад, баючыся разруху на груньце „сымпатыяў насяленьня" да прынца Караля, увёў жорсткую цэнзуру, загадаўшы перадусім не ўспамінаць навет іменьня гэтага пазбаўленага трону ды выгнанага з краю памершым каралём сына.

Цяпер газэты паведамілі аб скасаваньні цэнзуры ў краі. Але... але міністар унутраных спраў сабраў да сябе ўсіх рэдактароў сталічных газэт і карэспандэнтаў правінцыяльных часопісяў, ды заявіў ім, што — калі хто з іх дапусьціць у сваіх газэтах якую вестку аб гэтым прынцу Каролю,—дык урад ізноў увядзе цэнзуру... Каротка, але за тое—ясна...

Знайшлі адпаведную мову для Англіі.

Злучаныя Штаты зразумелі, як трэба размаўляць з Англіяй — у справе „разбраеньня". Англія, пазываючыся на тое, што яе дзяржава раскідана, па ўсім сьвеце (прасьцей кажучы, — нарабавала ды захапіла гвалтам вялізарную масу чужой зямлі), заяўляе, што яна патрабуе — дзеля асаблівай аховы сваіх валаданьняў наймагутнейшага з усіх флёту. Але тая-ж Англія прызнала за Амэрыкай на Вашынгтонскай Канфэрэнцыі права на роўны з сваім флёт. Амэрыка, доўга намаўляла Англію да паразуменьня, але гэта, як ведама, ня ўдалося. Англія сарвала канфэрэнцыю, заявіўшы, што будзе не зьмяншаць, як абязалася ў Вашынгтоне, але—павялічываць свой флёт. Тады Амэрыка, ведаючы, што Англія ня толькі залежна ад яе фінансава, але гаспадарча стаіць, можа, недалёка ад банкруцтва, заявіла: Добра,—будуй...—пабачым толькі, ці знойдзеш на гэта грошы, калі мы табе папсуем ізноў твой намі-ж падпраўлены „фунт". А датаго-ж яшчэ—пачнем побач з табой будаваць флёт і мы. А тады—пабачым, хто здолее хутчэй набудаваць браняносцаў ды крэйсэраў: ты, ці мы...

Як падало толькі-што амэрыканскае прэсавае агенцтва, вашынгтонскі ўрад пастанавіў распачаць фарсавачым маршам выкананьне „вялікай марской праграмы", зрабіўшы закладзіны адразу 26 вялікіх ды меншых ваенных караблеў. У працягу 8 гадоў гэтая будова будзе скончана. Але гэта зусім ня значыць, што за гэтыя 8 гадоў ня будуць закладзены новыя браняносцы ды крэйсэры. Апрача таго, зараз-жа пастаноўлена нарабіць шмат новых аэрапляпаў.

Амэрыканская прэса вітае гэты рашучы крок амэрыканскага ўраду, лічучы, што толькі такой „мовай" можна гутарыць з Англіяй, каб змусіць яе выконываць свае дагаворы... аб „разбраеньні"...

Адным словам,—пачалося ў вялікім маштабе тое, што было да вайны, дый што, праўду кажучы, ніколі ня спынялася: рыхтаваньне да новай сусьветнай разьні.

Паўстаньне чырвонаскурых.

У дзяржаўках Паўдзённай Амэрыкі — Чылі і Балівіі — паднялося паўстаньне чырвонаскурых індзейцаў. Чылійскія індзейцы, у лічбе 50.000 чалавек, злучыліся з таварышамі з Балівіі ды пачалі наступленьне на ўрадавыя войскі. Барацьба ідзе не на жыцьцё, а на сьмерць, дый—з зьменным пасьпехам. Дагэтуль гэтыя чырвонаскурыя, якія маюць надзвычай шляхотную натуру, страшэнна эксплёатаваліся „белымі", дый папросту—вымiралі без пратэсту. — А вось цяпер і яны далучыліся таксама да агульнага вызваленчага руху „каляровых народаў" на ўсім сьвеце...

Урад і ўрадоўцы.

Сярод дзяржаўных урадоўцаў у Польшчы расьце нездаволеньне — з прычыны запраўды-ж дзіўнай „тактыкі" ўраду адносна да сваіх працаўнікоў.

Справа йдзе аб паляпшэньні быту дзяржаўных урадоўцаў, якія ў 1925-1926 г.г. вынясьлі на сваіх карках цяжары „дзяржаўна гаспадарчай санацыі", ды—коштам страшэнных галодных дэфіцытаў у сваіх хатніх бюджэтах—далі магчымасьць ураду зраўнаважыць дзяржаўны бюджэт Польшчы... Калі справы — **пасьля траўня**, як кажа ўвесь час урад,—значна паправіліся, урадоўцы паставілі на чаргу дня паправу свайго быту, прынамся хаця-ж бы зварот таго, што яны атрымлівалі перад „эрыядам санацыі".

Трэба дадаць, што цяжары „фінансавай санацыі" ў Польшчы панясьлі ня толькі дзяржаўныя ўрадоўцы, але і ўся работніцкая кляса наагул. Бо-ж ясна, што, калі ўрад скасаваў дадаткі на дарагоўлю для сваіх працаўнікоў, дык гэта дало „маральную падставу" тое-ж самае зрабіць і ўсім прыватным працадаўцам для сваіх работнікаў. А з гэтага выплывае, што гэтая „дзяржаўна-фінансавая санацыя" ў Польшчы, так страшэнна ўдэрыўшы па працоўных масах краю, для валадаючых „капіталамі" працадаўцаў, ды наагул для буржуазіі, была — вельмі даходным „прадпрыемствам"... — Польская буржуазія аднача сна дзерла скуру з сваіх работнікаў, адмаўляючы ім дадаткаў на дарагоўлю і яшчэ паніжаючы ім плату, ды — побач з гэтым—падвышала цэны за хлеб дый за іншыя прадукты першай патрэбы... Калі да таго ж дадаць, што заможныя клясы дагэтуль не плацілі маёнтковага падатку, дык райскае жыцьцё польскай буржуазіі—асабліва ад „грознай" для яе сьпярша „маёвай рэвалюцыі" — адмалюецца перад намі ў-ва ўсей яго красе...

Няма што казаць: шмат спадзяваліся наіўныя людзі ад гэнай „рэвалюцыі"... Але спадзяваньні споўніліся толькі для паноў афіцэраў, якія—зараз-жа пасьля перавароту—атрымалі вельмі значныя падвышкі пэнсіяў... Рэшта дзяржаўных працаўнікоў атрымала — абяцанкі...

Калі ўрадоўцы пачалі хвалявацца, тады міністар Бартэль—у жніўні леташн. году — адказаў ім, што цяпер даць падвышку не дазваляе раўнавага бюджэту, але — вось ад новага году, дык дадаткі дзяржаўныя ўрадоўцы ўжо маюць пэўна, як у кішані... Пад націскам арганізаваных урадоўцаў ад 1 студня дадзены 10 прац. дадаткі. Усемагутныя ў краі абшарнікі вывезьлі ўвесь хлеб з краю. Цэны падняліся—аж на 25 прац. Тады ізноў надзіва пакорныя польскія ўрадоўцы вясной пачалі наракаць. Ізноў выйшаў на сцэну віцэ-прэм. Бартэль і заявіў, што дадаткі будуць—ад ліпня... Але прышоў ліпень. Як прыйшоў, так і прайшоў — без падвышак...

Цяпер, як сцьвярджае Дзяржаўн. Статыстычны Камітэт, плата ўрадоўцам — на 25 прац. ніжэйшая за кошты ўтрыманьня... Ізноў—з пачыну чыгуншчыкаў, якіх асабліва баіцца кожны ўрад, ды якія аказалі асаблівыя ўслугі марш. Пілсудскаму ў траўні леташняга году,—пачаліся пратэсты й дамаганьні з боку ўрадоўцаў. Ізноў зьявіўся на сцэне п. Бартэль, каб заявіць, што — для чыгуншчыкаў падвышкі будуць ад 1 верасьня, а для рэшты—ад 1 кастрычніка...

Урэшце ўрад абвясьціў сваю пастанову аб гэтых падвышках, аб якой мы ўжо паведамлялі.

Пастанова гэтая выклікала страшэннае нездаволеньне сярод чыгуншчыкаў і рэшты дзярж. працаўнікоў...

Галоўная справа Саюзу Чыгуншчыкаў афіцыяльна заявіла ўраду, што гэтыя „падвышкі" зьяўляюцца супярэчнымі з тым, што ўрад урачыста абяцаў чыгуншчыкам, дый што яны папросту **ня могуць быць уведзены ў жыцьцё**...

Зьезд машыністаў у Вільні катэгарычна пастанавіў „адкінуць гэтыя праекты ўраду, як зусім **немагчымыя для прыняцьця**", і дамагацца запраўдных дадаткаў, адпавядаючых узросту коштаў утрыманьня". Зьезд дадаў што „для абароны сваіх слушных, але столькі разоў ужо патаптаных правоў чыгуншчыкі, даведзеныя да крайнасьці, будуць змушаны хапіцца ўсіх даступных ім спосабаў, **не выключаючы і забастоўкі**"...

Рэшта дзяржаўных урадоўцаў, значна менш актыўная ды менш „адважная", як чыгуншчыкі, аднак жа таксама заявіла свой рашучы пратэст проці „дадаткаў на кватэру" якія прызнаў ёй урад. Гэтыя „аднаразовыя" дадаткі—вельмі буйныя для вышэйшых ўрадоўцаў, а для вялізарнай масы драбнейшых—папросту дробная падачка ў колькі-дзесяткоў злотых, дый яшчэ — падзеленыя „на раты" (найменшая лічба для найбольш чысьленай масы ўрадоўцаў—нешта 17 злотых)...

І вось, пачалося хаджэньне дэлегацыі Цэнтр. Камісіі Саюзу Дзярж. Урад да таго-ж віцэ-прэм. Бартля, каб „выясьніць" яму ўсю крыўднасьць гэтых „дадаткаў"... Але п. Бартэль усьцяж — адкладае „аўдыенцыю" (прыймо) для дэлегацыі. Толькі-што ён ізноў адлажыў гэтую аўдыенцыю — яшчэ на дзьве тыдні...

ХРОНІКА.

Водгук справы Сакко і Вацэтті ў Вільні. Паміма дэманстрацыйнага выступленьня ў мястовай радзе Вільні ўсяе лявіцы—на карысьць Сакко і Ванцэтті,—у Вільні, як падаюць газэты, ідзе сільны рух сярод работнікаў, каб распачаць забастоўку пратэсту з тэй-жа мэтай.

Справа рэдактара Шылы. 17 га жніўня с. г. віленскі акружны суд разглядаў справу рэд. Шылы за зьмяшчэньне ў ягонай газэце яшчэ ў 1923 годзе жалабы судзьдзі Багданава да Прэзыдэнта Рэспублікі. У гэтай жалабе судзьдзя Багданаў абвінавачываў цэлы рад прадстаўнікоў улады ў процізаконных учынках.

Суд засудзіў рэд. Шылу на 3 месяцы вастрогу. Рэд. Шыла на гэты прыгавор падае апэляцыю.

Ну і заілгаліся! Ня гледзячы на поўную кампрамітацыю ярэмічавых сельсаюзьнікаў на адбытай нядаўна іх „канфэрэнцыі" ня гледзячы на скандальны правал іх на самаўрадавых выбарах, — „Сялянская Ніва" стараецца рабіць від, быццам у іх — „усё добра"!

Ужо пасьля таго, як урадавая статыстыка выясьніла, што сярод новаабраных гмінных радных у віленскім ваяводзтве — **102 „здэкляраваных грамадаўцаў"**, ды — паводле „Кур. Віл."—**каля 400 „укрытых грамадаўцаў"**, а толькі 19 хадэкаў, **10 (дзесяць) сельсаюзьнікаў** ды 7 (сем) „полёнофілаў" (паўлюкевічаўцаў), — у „Сялянскай Ніве" надрукавана гэткая заметка:

„Па віленскім ваядодзтве прайшло ўсяго ў валасныя самаўрады 64 проц. беларусаў, з якіх **першае месца займаюць сябры сымпатыкі Сялянскага Саюзу**, пасьля былы Грамады і Бел. Хадэкаў. Палянафілаў зусім няма".

Каго паны Ярэмічы ды Рагулі хочуць гэтым ашукаць?!

„Аджыўшыя" Беларускія эсэры. Да лічбы супрацоўнікаў аднэй з „агентур", якія ста-

раюцца раскладаць і разьбіваць беларускі вызвольна-адраджэнскі рух, прыбывае новая палітычная „фірма". Як ведама, пару гадоў назад партыя беларускіх эсэраў на сваім партыйным зьезьдзе настанавіла зьліцца з Камуністычнай Партыяй Беларусі. Не згадзіліся з гэтай пастановай толькі тры асобы спасярод замежнае эміграцыі: Грыб, Мамонька і Бадунова. Апошняя хутка „выбыла з іх строя", бо захварэла (звар'яцела). Астаўшыяся два апошнія „праўдзівыя" эсэры падзялілі між сабой ролі: адзін прыехаў у Вільню і адразу-ж увайшоў у сувязь з Гурыным і Умястоўскім; другі маніцца ехаць з Прагі ў Амэрыку. Першы — „ведамы" Мамонька— цяпер з надобных да сябе асоб „узнаўляе" на віленскім груньце „партыю" эсэраў, якая—побач з Ярэмічам і Рагуляй—мае працаваць (ведама-ж, з дазволу польскае ўлады!) над зьдзейсьненьнем „незалежнасьці" Беларусі ...ад Масквы!..

Бедная ты, незалежніцкая ідэя: хто табой не спэкулюе?! Пасьля Ярэміча й Рагулі — Паўлюкевіч, Умястоўскі — урэшце Мамонька....

Высылка расейскіх манархістаў. Паводле газэтных вестак, расейскія эмігранты, якім польскі ўрад загадаў выехаць з Вільні і з Польшчы, ужо выехалі самахоць, апрача Зубкова, якога паліцыя мусіла вывезьці сама. На просьбу Зубкова, яго вывезьлі ў Гданск, дзе аселі і другія высланыя расейцы.

Зубков—стары царскі паліцэйскі служака, ды, як апавядаюць, на такой-жа службе быў цішком і ў палякоў.

Афіцыяльны курс грошы на 16 жніўня Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

16./VIII. на чорн. біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цен.

Маленькі фэльетон.

Гульня ў незалежнасьць.

У вялікім мястэчку кірмаш. Праходзячы па тарговым пляцу, я чуў, як заклікалі гандляры:

— Сюды, сюды!—у мяне тавар найлепшы. Хусткі, панчошкі, пярсьцёнкі, брошкі! Таней як усюды, амаль-што задарма!

А далей:

— Сярпы новыя! Косыя сталёвыя! Граблі і вілы,—купляй браце мілы!

Крык... Гоман... Шум...

Жыды—гандляры заступаюць дарогу. Рвуць за полы, цягаюць на ўсе бакі. Кожны заве к сабе,—кожны свой тавар хвале.

Навет касьцельны дзед і той свой тавар хвале—не нахваліцца:

— Ражанцы, шкапяеры! Абразікі — сьвянцоныя! Мэдалікі—цудоўныя!..

І гэтак далей і далей...

Уцякаю хутчэй, каб ня чуць гэтага крыку-гоману.

А пад касьцёлам дзяды і бабы павыцягвалі рукі і проста за ногі хапаюць.

Крычаць, пяюць хто ў свой голас:

— За душкі жывыя,
За душкі ўмарлыя,
За хворых, канаючых,
За збаўленьня чакаючых —
Мы за ўсіх памоооолімся!..
Паночкі праходзячыя,
Бабулькі міласэрдныя,
Дзяўчаткі прыгожыя,
Панічы харошыя, —
Дайце хто—грошычка,
Хто—яечачка,
Булачку, кілбасачку, —
Мы за вас памоооолімся!..

Колькі пастак пастаўлена на сялянскі цяжка-запрацаваны крывавы грош! Там удвая-трая даражэй бяруць за бязвартасную крамную тандэту. Тут рай на небе дакляруюць.

Ідучы дамоў думаў усю дарогу: калі гэта беларускі народ прагоне ад сябе зграю розных абдзіралаў?

І ўспомніў я, што і ў нашым беларускім руху гэтак сама шмат розных гандляроў разьвялося. Залажылі яны свае шопкі-крамкі і давай да сябе народ заклікаць:

— Гэй, уступайце ў нашу партыю „эсэраў"! Мы вам дамо і зямлю і волю. Будзеце сабе піць, есьці, весяліцца і нічога не рабіць! — крычыць вядомы нам эсэраўскі гандляр.

А далей крычыць, заплыўшы салам лідэр з „Сялянскага Саюзу":

— Гэй, мужычкі-дурачкі! Сялянкі і сяляне, для вас мы маем сяньня „Беларускі Сель-Саюз"! Запісвайцеся ў нашу партыю! Мы раздаем зямлю бяз выкупу направа і налева, — хоць самі для сябе цішком купляем за грошы! Да нас. Да нас!..

А далей, у хвасьце за імі, сам „доктар" Паўлюкевіч крычыць, аж пенай пырскае:

— Ня слухайце нікога!—У маей „Беларускай Нацыянальнай Радзе"—самы лепшы, самы праўдзівы тавар! Новамодныя фашыстаўскія кашулькі,—тавар *первый сортъ* à la Каварда!

А ў тахт ім утораць беларускія хадэкі...

І ўсе яны рознымі хітрыкамі стараюцца абдурыць сялян-беларусаў.

І ўсе яны, (толькі кожны пасвойму), крычаць:

— Толькі мы маем права гаварыць ад імя Беларускага Народу!

— Толькі мы маем манаполь на беларускасьць!

— Беларусы, гэта—мы!

Бо:

— Мы ўсе гандлюем „незалежнасьцяй" Бацькаўшчыны—Беларусі.

Слова „незалежнасьць" выгаварываецца вельмі прыгожа, мілагучна... Але, як-бы яна—гэтая эсэраўская, сельсаюзьніцкая, або навет паўлюкевічаўская „незалежнасьць" — выглядала на дзеле?

Ды вось бяда, што бачыць нікелі ня прыдзецца. Казаў мне адзін дзед, — а яго ў нашай вёсцы прарокам завуць: ён ўсё наперад ведае!—дык ён казаў, што больш ніякіх паноў над мужыком ня будзе. А ведама-ж, што эсэры, сельсаюзьнікі, хадэкі, умястоўшчкі і іншыя паўлюкевічаўцы, калі самі не паны, дык панскія падлізьнікі, значыцца і яны над сялянамі панаваць ня будуць.

Але незалежнасьць будзе. Будзе якраз тады, калі беларускі селянін вялізарнай мятлой прагоне ўсю гэтую хаўрузію—і тых, каму яна служа!

Так казаў той вясковы прарок. Слова яго—сьвята! **Кузьма Дубец.**

Выбары у Самаурады.

Выбары ў Вялейскай гміне.

Калі мы пачулі аб выбарах, дык у кожнага ад радасьці аж лыдкі задрыжэлі. Нарэшце і мы дачакаліся, што можам выявіць сваю волю, можам і мы выбраць свайго войта на мейсца цяперашняга тутэйшага паляка — падлізьніка! „Дзякуй" Вялейскаму старасту павінен быў сказаць кожны грамадзянін нашай воласьці, але...

Вось гэтае „але" заўсёды перашкаджае нармальнаму развіцьцю працы ў нашым сучасным жыцьці. „Але", — гэтае і прымусіла напісаць да ведама ўсяго грамадзянства, каб ведалі і знали, якое нам, беларусам, жыцьцё пад дэмакратычнай Польшчай.

Так пачынаю аб выбарах:

У адзін прыгожы дзень інспэктар гмінных самаўрадаў сазваў вызначаныя абвадовыя тройкі ў гміну і запрапанаваў ім вызначыць на гэтым сходзе выбаршчыкаў — дэлегатаў з кожнага абводу. Але (вось ізноў гэтае „але") інспэктар з першага разу апёкся. Ен думаў, што вызначаныя ўрадам тройкі, будуць скакаць пад ягонную дуду, як яму хочацца. Тройкі заявілі: „вызначаць ня будзем, гэта дзела самога народу"!

Выбары дэлегатаў у абводах адбыліся добра. Выбралі ўсіх сьвядомых беларусаў, апрача Баранцаў і Бараўцоў, якія выставілі кандыдатам абшарніка Мысьлінскага.

Вось і выбары. Вызначаны былі ў 11-ай гадзіне, а пачаліся толькі аж у 5 ці 6 гадзіне па паўдні. Гэта рабілася зумысна, каб здэмаралізаваць сялян, каб яны выбралі панскіх падлізьнікаў, якія на выбары прышлі і прыехалі з гарэлкай у кішані, як напрыклад Барачэўскі Нікадзім. Яны думалі, што гарэлкай купяць сумленьне сьвядомых беларусаў. Ды ніводзін з падлізьнікаў у раду не папаў. Выбралі 12 сьвядомых беларусаў (былых грамадаўцаў). Баранцы і Бараўцы тут падцягнуліся і за „свайго пана" не галасавалі. У салю, гдзе адбываліся выбары, былыя радныя з застэмпцам Андрыеўскім на чале хацелі быць на выбарах; ім надта хацелася ізноў парадзіць, асабліва хацелася Андрыеўскаму, але іх з сорамам вывялі з салі.

Праз два тыдні адбыліся выбары войта, застэмпцы і лаўніка. Перад выбарамі інспэктар гмінны вызываў кожнага раднага да сябе, як ксёндз на споведзь, і тут стараўся кожнага здэмаралізаваць: гаварыў, каб ня выбіралі тых, каго хочуць сяляне, а выстаўляў замест іх сваіх кандыдатаў. Абяцаў і белы хлеб і быкоў швайцарскіх і чуць ня птушынага малака, але і на гэты раз апёкся. У ўрад гмінны выбралі трох сяброў з той-жа рады... Праз тыдзень прышла вестка, што ўрад гмінны старастам не зацьверджаны. Чаму? прычына якая? Пытаньне так і асталося ня вырашаным.

Я і забыўся сказаць, што рада была зацьверджана, і вось з ліку сяброў гэтай зацьверджанай рады быў выбраны гмінны ўрад; дык падумайце, добрыя людцы, гдзе-ж у слупоў польскай дзяржавы лёгіка? Самі-ж сябе і паганяць, у свайго-ж дуба дый самі падрываюць карэньне!

Праз тыдзень былі вызначаны другія выбары, на якіх ізноў выбралі тых самых. Прысутны стараста нешта прабарматаў у нос сабе і паехаў на самаходзе, надта не задаволены.

На першым паседжаньні гміннай рады мы даведаліся, што стараста і на гэты раз не зацьвердзіў выбраных намі людзей, бо прыслаў паперу, якой дазваляе ўрадаваць стараму ўраду — да выясьненьня справы. На гэты гвалт рада на гэтым-жа пасэджаньні пастанавіла: ці забраць войта Харэвіча, які страціў добрую славу ў сялянства сваімі выбрыкамі, ці разьвязаць раду. Пабачым, што на гэта адкажа Вялейскі стараста.

Дык вось, добрыя людцы, якія ў нас парадкі, якія выбары! На чорта былі вызначаны і выбары, калі хочуць, каб мы выбіралі таго, каго „ім" хочацца? Назначайце сваіх адразу і толькі, а не марочце добрых людзей сваей „выбарчай ардынацыяй".

Падкрэсьліваючы такія надужыцьці, прыходзіцца ўсё ж такі адзначыць, што расьце сьвядомасьць сярод беларускага грамадзянства.

Чэсьць Вам, сьвядомым беларусам, дамагайцеся сваіх грамадзкіх правоў, якія маюць грамадзяне палякі і другія культурныя народы! **Гмінны.**

Чуў я, што 4-га верасьня будуць выбары мястовае рады ў Вялейцы. Цікаўна, як аднясуцца да гэтага пытаньня Вялейчанебеларусы. Няўжо-ж здрадзяць справу беларускага адраджэньня.

Крапіцеся, Вялейчане! Усе, як адзін, на выбары! Усе, маючыя поўных 21 год, павінны галасаваць за свой сьпісак. Усе: жанчыны і дзяўчаты — таксама павінны падтрымаць сваіх бацькоў, мужыкоў і братоў і ісьці на выбары!

16, 17 і 18 будуць выстаўлены сьпіскі выбаршчыкаў, кожны грамадзянін ці грамадзянка павінен спраўдзіць, ці ёсьць ён у сьпіску; калі няма, дык папытацца ў Магістраце, чаму.

Усе на выбары! Споўніце свой грамадзкі абавязак! **Вялейчанін.**

Выбары ў гмінную раду.

(Сьвіслацкай вол. Ваўкав. пав.).

У нядзелю 31 ліпня с. г. адбыліся выбары ў нашу гмінную раду. Сяброў гміннага сабраньня была выбрана 138, на выбары прышло 131. Дзіўным ёсьць тое, што ў сябры гм. сабр. папала значная частка падпанкаў, якія, вядомая рэч, хоць і тутэйшыя, але ўсё-ж такі лічаць сябе палякамі.

А сталася гэта таму, што кіраўнікамі абвадовых сходаў былі людзі „pewne", калі не асаднікі, то абшарнікі, або іх падлізы і тут-жа на сходах выстаўлялі свае кандыдатуры. Там, дзе вёска больш сьвядомая, дзе даходзіць бел. газэта, там такія панкі атрымалі дулю, як напрыклад абшарнік з двара Квашэры Бітнэр, які быў „przewodniczący" абвадовага сабраньня ў вёсцы Палонна ў 16-вярстовай адлегласьці ад Квашэраў.

Але былі і такія вёскі, што хоць і адчувалі інстынктыўна, што ня трэба выбіраць людзей, якія не заслужываюць на веру сялянства, усё ж такі, калі пан ставіўся на галасаваньне — ну то як ня выбраць пана, гэта-ж „пан"! Такую недарэчнасьць утварыла вёска Красна, дзе быў выстаўлены кандыдатам адміністратар сумежнага двара, адвечны беларусаед, велькі патрыёт „monopolówki" ў той час, як вёска магла-б правясьці сваіх людзей, праўда хоць і ня надта граматных, за-тое людзей практычных, якія напэўна ведаюць балячкі сялянства ў тысячу раз лепей, як „пан" з маёнтку; усё ж такі выбралі пана...

* * *

Пачалося падрыхтаваньне да ўтварэньня сьпіскаў.

Беларусы стаялі за ўтварэньне аднаго сьпіску беларускіх сялян, што і зрабілі.

Усё было-б добра, каб не кар'еровічы. Так Аўдзейчык Янка з фальварку Рудаўка, пабачыўшы, што яго кандыдатуры ў утварыўшымся сьпіску беларусаў — няма—гэты „тып" стаў тварыць новую лісту, дзе вядома, выставіў сябе на забясьпечаным мейсцы. Такім чынам было пададзена 11 сьпіскаў кандыдатаў, у тым ліку адзін сьпісак беларусаў.

Ня гледзячы на тое, што, дзякуючы адарваньню праз Аўдзейчыка некалькіх галасоў, усё-ж такі беларусы па сваім сьпіску правялі 7 радных, тады як рэнегат Аўдзейчык праваліўся і змарнаваў яшчэ пару мандатаў, якія атрымалі-б беларусы.

У раду засталіся абранымі: 9 беларусаў, 1 абшарнік, 3 палякі і 1 асаднік.

Ганьба табе панскі падліза! Ганьба яшчэ большая таму, што ты сябе лічыш беларусам. Сваім неабдуманым крокам ты падарваў можнасьць утварыць у самаўрадзе сапраўдную беларускую большасьць.

Народ запомні імя гэтага кар'ерыста!

У будучым мусіш даць адпор такім „блюдалізам".

Як паны так і свае „кулачкі" лічаць яшчэ на нашу цемнату, але час ім крыкнуць: Рукі проч ад сялянства! **М. Ланцэт.**

Выбары ў валасную раду.

(м. Любча, Навваградзкага пав.).

Грамадзяне Любчанскай воласьці з вялікаю радасьцяй адсьпявалі сваей старай радзе „Са сьвятымі ўпакой". Мала хто плакаў, бо была ня родная. Выбары новае рады прайшлі досьць ажыўлёна. Сабралася аж 127 выбаршчыкаў, з якіх трэба было выбраць 13 радных. Было выстаўлена шэсьць сьпіскаў. Па пяцёх сьпісках прайшло 13 радных, а шосты сьпісак абшарніка Бруханецкага праваліўся. Радныя дзеляцца гэтак: асаднік, ксёндз, жыд і дзесяць беларусаў, у лічбе якіх ёсьць вучыцель Навваградзкай Белар. Гімназіі Чатырка і пасол Рагуля. Як асаднік, так і ксёндз, прайшлі галасамі беларускага сялянства, што адмовіліся ад агульна-беларускага сьпіску. Ксёндз прайшоў галасамі далятыцаў, якія, відаць, аддзякавалі кс. пробашчу за тую хлеб соль, што два гады таму назад елі ў Навваградзкага біскупа. Адбыліся выбары ў нас і войта. На войта абраны нехта Сьцяпан Кот. Бяда будзе мышам і пацукам, якіх у нашай Любчанскай гміне досыць разьвялося. Раней выкурвалі іх „Бакуном" (стары войт Бакуновіч), а цяпер катом, але, ня гледзячы на гэта, пацукі як жылі так і жывуць, як псавалі, так і псуюць.

Да павятовага сойміку засталіся выбранымі Чатырка і Рагуля. Як кажуць, хацеў туды папасьці і Далятыцкі пробашч, але дзеля таго, што за яго асобу галасаваў адзін толькі асаднік Юрчык — праваліўся. Вось і ўсё. Чакаюць цяпер сяляне і палепшаньняў ад новае Рады і ад новага Сойміку. Што яны дадуць нашаму сялянству, яшчэ ня ведаем, але блізкая будучына павінна паказаць. **Тутэйшы валацуга.**

Карэспандэнцыі.

Палючая патрэба.

Ужо колькі гадоў мы лятуцелі аб будове Народнага Дому, гдзе маглі-б, бяз ніякіх перашкодаў, ладзіць спэктаклі ды розныя разумныя гульні з мэтай пашырэньня роднае беларускае культуры і асьветы сярод сялян вакалічных вёсак. Дзякуючы асаблівым неўраджаям у гэтых гадох, ды беднаце, безрабоцьцю вёскі, лятуценьні нашы так і аставаліся толькі імі. Да гэтага часу ладзілі спэктаклі ў гумнах, але цяпер пану старасьце чамусьці гэта не спадабалася, бо забараніў і пэўне на—заўсёды, а іншага адпаведнага будынку ня маем. Пры гэтых варунках будоўля Народнага Дому зьяўляецца палючай патрэбай нашай ваколіцы.

Азіраўскі гурток Т-ва Беларускае Школы, лічучы і на свае сілы, гэтым зварачываецца да грамадзянства, асабліва да беларусаў-амэрыканцаў, з просьбай аб дапамозе.

Ужо напісалі адно пісьмо ў гэтай справе да нашых братоў у Амэрыцы і спадзяемся, што яны падтрымаюць нас!

Старшыня: **Філіповіч.**

Як у нас выбіралі солтыса...

(Вёска Каралеўцы, Войстамскае гміны, Вялейскага павету.

22 красавіка сёл. года ў нас адбыліся перавыбары грамадзкага солтыса. Стары солтыс В. Дурэйка праз два гады сваей службы вельмі стараўся дагадзіць свайму начальству, бо-ж, дзякуючы яго даносам, шмат каму з сялян прышлося пацярпець карамі. За гэткую ўгоду ён прыдбаў сабе прыхільнасьць з боку начальства, але за тое страціў пашану сярод грамадзянства.

Прысутны на выбарах „сам" войт п. Талочка, вызначаны павятовым старастай асаднік, за ўсялякую цану стараўся, каб сяляне ізноў выбралі на солтыса В. Дурэйку. Усіх выстаўленых кандыдатаў бракаваў, адных як няпісьменных пасольску, другіх як былых „грамадаўцаў" і інш. Але ўсё-ж такі сяляне не паслухалі пана войта і выбралі на солтыса Янку Кабака, грам. з суседняе вёскі Любкі. Толькі дзеля таго, што па прапазіцыі п. войта галасаваньне адбывалася, як звычайна, не надняцьцем рук, а проста пераходам „направа і налева" (за „старога" і за новага солтыса) некаторыя баяліся страціць „ласку" ў старога солтыса, апошні па „ліку галасоў" быў усё-ж такі выбраны на заступніка.

Аднак Вялейскі стараста на становішча солтыса Янку Кабака не зацьвердзіў, у той час як В. Дурэйка на заступніка зацьверджаны.

Дзеля гэтага, цяпер 31-га ліпня г. г. адбыліся ўзноў выбары. На гэты раз прысутным быў заступнік войта Салагуб, бо „сам" войт, як кажуць, паехаў дамоў (у сваю асаду) на адпачынак. Але таксама і заступнік войта стараўся правясьці на солтыса былага солтыса, а цяпер заступніка В. Дурэйку, прапануючы толькі выбраць да яго „новага" заступніка і паясьняючы тым, што так будзе выгадней і менш работы (о! для каго, а для п. войта і яго заступнікам пэўне „выгадней" мець свайго падлізьніка) дый новага солтыса стараста ізноў не зацьвердзіць.

Як першы раз, таксама і цяпер сяляне не паслухалі ўсіх гэткіх нагавораў, а толькі больш зразумелі, аб чым тут ходзіць „начальству", каб за солтыса быў войтаўскі падлізьнік В. Дурэйка.

На гэты раз аказаўся выбраны на солтыса Янка Заянкавіч, грам. з вёскі Каралеўцы. Ці зацьвердзіць пан стараста гэтыя выбары, не вядома.

Дык вось, дарагія браты Грамадзяне! Вучыцеся бараніць свае інтарэсы арганізавана, бо тады ашукаць Вас ніхто ня здолее.

Чэсьць і хвала сьвядомым грамадзянам, адмовіўшымся ісьці за панскімі падлізьнікамі па рэцэпту паноў войтаў і іх заступнікаў!

Ганьба тым, каторыя сьведама не пашлі на выбары, думаючы, што дзеля гэтага не адбудуцца выбары і застанецца ізноў стары солтыс. Выбаршчык: **М—ша.**

Усячына.

Сьмертаносныя вынаходкі.

Французскі інжэнэр Фушо Вільлерль хоча праславіцца, як вынаходца электрычнае гарматы, якая, дзякуючы сваім канструкцыйным асаблівасьцям, можа выклікаць поўны пераварот у артылерыйскай справе. Гэта гармата страляе бяз дыму і гуку, ня псуецца так хутка, выпушчае стокілёвыя снарады з нячуванаю хуткасьцю, вымагае значна меншай абслугі,—адным словам, мае шмат перавагаў перад звычайнай гарматай.

Вынаходка амэрыканскага тэхніка.

З Варчэстэра ў штаце Массачузэт даносяць, што вядомы фізык Робэрт Годдарт робіць спробы ў сваёй лабараторыі з машынай, якая часткова зьяўляецца самалётам, а часткова ракетай. Гэта машына павінна быць ужыта дзеля зносінаў паміж Амэрыкай і Эўропай. Шыбкасьць яе павінна перавысіць шыбкасьць самалётаў у некалькі разоў.

Робэрт Годдарт працуе над сваёй вынаходкай некалькі гадоў.

Рэдактар-Выдавец: П. Кукляг.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.